*В. П. ГАРМАТНЫ*

# ПРАВЯДЗЕННЕ КАМАСАЦЫІ Ў НАВАГРУДСКІМ ВАЯВОДСТВЕ (1921—1939 гг.)

**Актуальнасць даследавання.** На сучасным этапе ў беларускім грамадстве ідзе вострая дыскусія наконт месца і ролі фермераў у сельскагаспадарчай вытворчасці, у сувязі з чым узнікае неабходнасць больш падрабязна і грунтоўна вывучыць вопыт папярэдніх аграрных рэформ, у тым ліку і ажыццёўленай польскімі ўладамі ў Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. Дадзены артыкул прысвечаны правядзенню польскімі ўладамі ў азначаны перыяд у Навагрудскім ваяводстве камасацыі — складаючай часткі аграрнай рэформы, галоўнаю мэтаю якой было стварэнне заможных сялянскіх гаспадарак фермерскага тыпу.

**Становішча сельскай гаспадаркі Навагрудскага ваяводства на пачатак 1920-х гг.** Навагрудскае ваяводства ўтворана польскімі ўладамі паводле Закона ад 4 лютага 1921 г. Плошча ваяводства складала 22 966,2 км$^2$, колькасць насельніцтва — 822 106 (перапіс 1921 г.) і 1 057 200 (перапіс 1931 г.) чалавек. У адміністрацыйна-тэрытарыяльным плане ваяводства падзялялася на 8 паветаў: Баранавіцкі, Валожынскі, Лідскі, Навагрудскі, Нясвіжскі, Слонімскі, Стаўбцоўскі і Шчучынскі (выдзелены ў 1929 г. з Лідскага) [20, с. 255; 26, s. 5], у сваю чаргу, паветы падзяляліся на гміны. Каля 80,7 % насельніцтва Навагрудчыны было занята ў сферы сельскай гаспадаркі, мясцовыя землі былі ў асноўным малаўрадлівымі (з іх ворныя складалі 42,7 %).

Дзеля таго каб уніфікаваць узровень эканамічнага развіцця новадалучаных зямель, якія да Першай сусветнай вайны (1914—1918 гг.) уваходзілі ў склад трох розных дзяржаў: Расійскай імперыі, Прусіі і Аўстра-Венгрыі, а таксама аднавіць разбураную дашчэнту падчас Першай сусветнай і Савецка-польскай (1919—1921 гг.) войн сельскую гаспадарку краю, польскі ўрад у 1921—1939 гг. ажыццявіў у Навагрудскім ваяводстве шэраг аграрных пераўтварэнняў [22, с. 71], а менавіта: парцэляцыю — продаж праз Дзяржаўны сельскагаспадарчы банк сялянам часткі памешчыцкіх зямель па фіксаваным кошце; камасацыю — аб'яднанне

---

**Гарматны Віталь Пятровіч —** магістр гістарычных навук, аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

раскіданых сялянскіх надзелаў у адзін з перанясеннем сюды хаты і гаспадарчых будынкаў і стварэннем такім чынам хутара; пераход сервітутаў — сумесных для карыстання памешчыкаў і сялян зямель (сенажаці, лес, паша і інш.) — да адзінага ўласніка, насаджэнне асаднікаў — перасяленцаў з карэннай Польшчы, якія на льготных умовах атрымлівалі зямлю на Навагрудчыне [21, с. 187; 25, s. 10].

**Заканадаўчае афармленне камасацыі.** З мэтаю ажыццяўлення аграрнай палітыкі ў Навагрудскім і часткова Беластоцкім ваяводствах на падставе распараджэння Савета Міністраў II Рэчы Паспалітай ад 23 сакавіка 1921 г. польскімі ўладамі створана Навагрудская (з цэнтрам у г. Гродна) зямельная дэлегатура, пераўтвораная па распараджэнні Савета Міністраў ад 20 сакавіка 1922 г. у акруговую зямельную ўправу (Nowogrodski Okregowy Urzad Ziemski, NOUZ, НАУЗ) [17, с. 26; 29].

Паводле дадзеных сельскагаспадарчага перапісу ад 30 верасня 1921 г., у сярэднім па краіне колькасць сялянскіх гаспадарак, у якіх налічвалася па 6—10 невялікіх раскіданых зямельных надзелаў, складала 23,5 % [1, с. 196]. Як прыклад надзвычай высокай цераспалосіцы можна адзначыць вёску Голдаў Лябедзскай гміны Лідскага (з 1929 г. Шчучынскага) павета, гаспадаркі якой па стане на 30 ліпеня 1924 г. распадаліся на 69—75 надзелаў ворных зямель і 22—25 лугоў, адносіны шырыні надзелаў да даўжыні складалі ад 1 да 150 [10, арк. 53 зв.].

З мэтаю ліквідацыі цераспалосіцы на падставе Закона, прынятага Сеймам II Рэчы Паспалітай 31 ліпеня 1923 г. [30], польскія ўлады правodзілі камасацыю. Просьбы аб камасацыі падаваліся ў павятовую зямельную ўправу ўладальнікамі не менш як 25 га [23, s. 13—14]. На падставе рашэння аб правядзенні камасацыі і пастановы акруговай зямельнай управы зямельны камісар для кожнай ніжэйшай адміністрацыйнай адзінкі вызначаў асобныя выбары рады (савета) ссялення (rada uczestnikow scalenia). Колькасць членаў рады залежала ад колькасці сялян вёскі і вагалася ад 3 да 7 членаў, у дапамогу якім выбіраліся намеснікі (zastepcy) колькасцю, роўнаю членам рады [30].

Перад правядзеннем камасацыі мясцовыя ўлады складалі падрабязны план работ па яе ажыццяўленні, заключалі папярэднюю дамову з землямерам, які складаў праект камасацыі вёскі. Для ацэнкі грашовай вартасці сялянскіх зямель пры камасацыі стваралася Ацэначная камісія (Komisja Szacunkowa). У яе склад уваходзілі зямельны камісар або падкамісар у якасці старшыні; мясцовы землямер і мінімум трое асабіста незацікаўленых у выніках камасацыі асоб, якія добра ведалі мясцовыя зямельныя адносіны. Рашэнне аб зацвярджэнні праекта камасацыі асоб-

най вёскі прымалася на пасяджэнні камісіі на чале са старшынёй мясцовай акруговай зямельнай управы, у складзе прадстаўнікоў міністэрстваў юстыцыі, сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ, ваяводскай і павятовай зямельных упраў, прадстаўнікоў вялікай, малой уласнасці і беззямельных.

Сяляне Навагрудчыны ў большасці разумелі неабходнасць камасацыі: напрыклад, 12 лютага 1925 г. на грамадскім сходзе сялян вёскі Раманавічы гміны Ражанкі Лідскага павета адзінагалосна было прынята рашэнне аб камасацыі і адзначалася, што размешчаныя ў цераспалосіцы «нашыя гаспадаркі ў звычайным стане не даюць магчымасці справядліва весці (асабістую гаспадарку), з-за чаго нясем вялікія страты як у справе сельскай гаспадаркі, так і ў прадукцыі, праз што вынікаюць і страты для дзяржавы...» [9, арк. 3]. Просьба сялян вёскі Раманавічы ўладамі была задаволена.

Па прычыне вялікай колькасці неабходных работ і складанага матэрыяльнага становішча заходнебеларускага сялянства першапачаткова камасацыя праходзіла даволі марудна [19, с. 34]. Па стане на 14 ліпеня 1927 г. у Навагрудскім ваяводстве праводзілася камасацыя 119 вёсак, якія складаліся з 8125 сялянскіх гаспадарак агульнаю зямельнаю плошчаю 72 879 га [4]. З мэтаю паскарэння камасацыі 14 студзеня 1927 г. выдадзена сумеснае распараджэнне міністэрстваў сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ і фінансаў аб аказанні дапамогі пераходзячым на хутар сялянам — на тэрмін да 15 гадоў выдаваўся банкаўскі крэдыт пад 4 % гадавых: да 1200 злотых на перанясенне будынкаў і 600 злотых на правядзенне меліярацыі [28].

**Крэдытаванне пераходзячых на хутары сялян Навагрудчыны.** На мэты крэдытавання сялян пры ажыццяўленні камасацыі ў Навагрудскай акруговай зямельнай управе (НАЗУ) мелася звычайна каля 200 000 злотых штогод, але ў цяжкіх фінансавых абставінах сусветнага эканамічнага крызісу 1929—1933 гг. бюджэт НАЗУ на 1932—1933 гг. не прадугледжваў выдання вяскоўцам буйных крэдытаў. Ва ўмовах сусветнага крызісу крэдытавая дапамога не магла быць аказана ўсім жадаючым, а толькі найбольш яе патрабуючым, і то ў найнеабходнейшай суме. Для выдачы хутаранам крэдытаў уладамі ствараўся спецыяльны фонд, які складаўся з аплат сялянамі за тэхнічнае выкананне работ па камасацыі і грошай з датацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ, таму работы па камасацыі сяляне павінны былі аплачваць перш за ўсё самастойна [14, арк. 42]. Разам з тым частка сялян усё ж атрымоўвала ў гэты перыяд крэдыты з дзяржаўнага бюджэту. Напрыклад, 16 верасня

1929 г. сялянам вёскі Засулле гміны Засулле Стаўбцоўскага павета былі выдадзены крэдыты на перанясенне будынкаў тэрмінам ужыцця на 2 гады і тэрмінам выплаты на працягу 10 гадоў, а таксама на выкопванне калодзежа на 1 год і 6 гадоў адпаведна на суму 4900 злотых [5, арк. 3].

Выплачваць крэдыты і аплачваць работы па ажыццяўленні камасацыі мясцовым сялянам было дастаткова цяжка, таму яны звярталіся ў органы ўлады з просьбамі аб памяншэнні выплат. Так, напрыклад, 22 кастрычніка 1931 г. селянін вёскі Філіпаўцы гміны Новы-Двор Шчучынскага павета Міхаіл Гуцко звяртаўся ў НАЗУ ў г. Гродна з хадайніцтвам аб адтэрміноўцы выплат за ажыццяўленне ссялення на 2 гады: «Становішча наша ёсць вельмі цяжкае, падчас (Першай) Сусветнай вайны выехалі мы ў Расію і гаспадарка наша была суцэльна знішчана і да гэтага часу не можам нармальна аднавіць гаспадарку і цяжка забяспечваць сям'ю, у гэтым годзе быў вялікі неўраджай, не маем таксама дастаткова інвентара» [12, арк. 45].

Польскія ўлады ўсяляк заахвочвалі жаданне сялян Навагрудчыны па камасацыі ўласных зямель. Так, 11 чэрвеня 1935 г. НАЗУ вызваліла сялян вёскі Навасады-Маякі Радуньскай гміны Лідскага павета ад выплаты дзяржаўнага зямельнага падатку пачынаючы з 29 красавіка 1935 г., таму што тэрмін аплат за тэхнічнае выкананне работ па камасацыі прыпадаў на 1 ліпеня 1935 г., але азначаныя работы яшчэ не былі падрыхтаваны [8, арк. 1].

**Надзяленне пры камасацыі малазямельных сялян Навагрудчыны ворнаю зямлёю.** Паспяховае ажыццяўленне камасацыі ў Навагрудскім ваяводстве было немагчымым без дадатковага надзялення зямлёю, але ў польскіх улад адсутнічаў дастатковы запас свабодных ворных зямель. З мэтаю надзялення сялян зямлёю польскімі ўладамі выкарыстоўваліся царкоўныя і касцёльныя землі («мёртвай рукі»), пры захаванні канкардатнага мінімуму ў 20 га. Сяляне вёскі Падлессе гміны Дарэва Баранавіцкага павета 30 мая 1925 г. падалі заяву аб скамасаванні іх зямель у памеры каля 620 га. 29 студзеня 1926 г. на пасяджэнні НАЗУ выступіў селянін азначанай вёскі Стэфан Віктаровіч. Ён прасіў перадаць на надзяленне зямлёю мясцовых сялян каля 85 га, якія належалі праваслаўнай парафіяльнай царкве ў Дарэве. Просьба сялян была ўладамі задаволена з мэтаю «ўзмацнення карлікавых гаспадарак» [3, арк. 5, 6].

Пры магчымасці камасацыі ўладальнікі карлікавых гаспадарак надзяляліся польскімі ўладамі дадатковаю зямлёю на платнай аснове да нормы ў 5,5 га III класа ў эквіваленце. Напрыклад, 13 красавіка 1932 г. гаспадаркі вёскі Кухіні Першыя Жалудокскай гміны Шчучынскага па-

вета распадаліся ў сярэднім на 8—9 ворных і 5—8 лугавых надзелаў, адносіны шырыні да даўжыні якіх складалі звычайна ад 1 да 80. Пры гэтым з 24 мясцовых гаспадарак 10 патрабавалася дадатковае надзяленне зямлёю ў памеры каля 24 га (з іх 7 пагадзіліся на набыццё зямлі ў навакольным маёнтку) [16, арк. 21зв.].

Пры ажыццяўленні камасацыі польскія ўлады надавалі вялікае значэнне выдзяленню надзелаў для грамадскіх патрэб сялян і рэгуляцыі дарог і даездаў. Напрыклад, 2 жніўня 1930 г. на капанне зямлі і пяску сялянам вёскі Голдаў Лябедзскай гміны Шчучынскага павета ў полі пад назваю «Курылаўшчына» быў адведзены надзел у 0,88 га зямлі III класа. 30 мая 1931 г. сялян азначанай вёскі ўлады абавязалі ў шасцімесячны тэрмін акапаць ірвамі дарогу з вёскі Голдаў да вёскі Парэчча, затым удзельнікі ссялення павінны былі заараць, забаранаваць і абсадзіць дрэвамі ўсе пракладзеныя палявыя дарогі на працягу 6 месяцаў, а лугавыя — давесці да належнага стану за 1 год [14, арк. 31].

Падводзячы вынікі работ па камасацыі на тэрыторыі ваяводства, старшыня НАЗУ Мікалай Ушацкі 8 чэрвеня 1931 г. звяртаўся да ўсіх мясцовых павятовых зямельных камісараў і адзначаў, што «непрыняцце хутароў сярод большасці скардзячыхся выклікана неадпаведнаю класіфікацыяй і ацэнкаю ссяляемых зямель, акрамя таго, праз немажлівае размяшчэнне выдзяляемых надзелаў <...> і нерацыянальнае размяшчэнне сеткі дарог і даездаў паміж вызначанымі надзеламі». У цэлым Ушацкі сцвярджаў, што больш актыўны ўдзел старшынь павятовых зямельных упраў у працы па камасацыі «паслужыць гарантыяй да больш рацыянальнага з погляду гаспадарчага выканання прац і спрычыніцца да памяншэння (колькасці) незадаволеных ссяленнем» [15, арк. 27].

**Асноўныя цяжкасці і праблемы пры ажыццяўленні камасацыі на землях Навагрудчыны.** Пры пераносе сялянамі на новае месца старых і ўзвядзенні новых будынкаў у спецыяльных дэкларацыях абгаворваліся ўмовы іх пабудовы [11, арк. 108]. Значнаю перашкодаю на шляху камасацыі стаў недахоп будматэрыялаў. Так, у Шчучынскім павеце па стане на 4 снежня 1931 г. на перанясенне будынкаў сялян патрабавалася не менш як 490 м$^3$ драўніны [14, арк. 182]. У такіх умовах 15—18 верасня 1932 г. інжынерам Казімірам Каліноўскім праведзена інспекцыя забудаванняў дробных сялянскіх гаспадарак Навагрудскага ваяводства пры ажыццяўленні камасацыі, падчас якой у 2 выпадках удалося на месцы застаць землямера — у вёсках Вялікія Кракоткі (1736 га) Слонімскага павета і Сурконты (420 га) Лідскага павета. У абодвух выпадках пры азнаямленні з планам і ходам работ па будаўніцтве назіралася неабходнасць больш

цеснага супрацоўніцтва землямераў з будаўнічымі аддзеламі павятовых зямельных упраў. Камісіяй адзначана адсутнасць цеснай сувязі паміж тэхнічна-будаўнічай дапамогай і выдачай крэдытаў на будаўніцтва пры камасацыі, неналежная арганізацыя кантролю за выкарыстаннем пазык на ўзвядзенне і перанос будынкаў [2, арк. 4].

Пры правядзенні камасацыі вельмі важнае месца займала ліквідацыя сервітутаў: напрыклад, 27 мая 1934 г. сяляне вёскі Рамейкі Цырынскай гміны Навагрудскага павета звярталіся ў мясцовую павятовую зямельную ўправу з заяваю «аб як мага хутчэйшым правядзенні ссялення і камасацыі нашых зямель. Просьбу сваю абгрунтоўваем тым, што ў выніку ліквідацыі нашага сервітуту ў маёнтку Варонча і выдзяленні таго ж у мясцовасці «Плюжыны» (гай «Цёмны Бор») у адлегласці 6—7 км, становішча нашае ў поглядах гаспадарчых і матэрыяльных абвострылася да немагчымасці <...> Адзіным спосабам паляпшэння сітуацыі бачым правядзенне камасацыі нашых зямель» [7, арк. 3].

Пры выкананні работ па абмеры і класіфікацыі сялянскіх зямель і падрыхтоўцы праекта ссялення на першае месца выходзіла асоба праводзячага камасацыю землямера, аб чым захаваліся як станоўчыя, так і адмоўныя сведчанні сучаснікаў. 26 мая 1930 г. Ян Сідаровіч з маёнтка Гердзевічы Ражанкаўскай гміны Шчучынскага павета пісаў, што «нейкі пан Дэбек (інжынер Яўген Дэмбек), магчыма са складу зямельнай управы, праводзіў камасацыю <...> без патрэбных інструментаў, на вока вызначаў надзелы жыхароў і навогул не жадаў нават прыймаць пад увагу заўваг, зробленых намі ў справе замены надзелаў і становішча гаспадарчага» [13, арк. 22].

7 кастрычніка 1935 г. сяляне мястэчка Цырын Цырынскай гміны Навагрудскага павета ў сваёй заяве пераканаўча прасілі «аб правядзенні ссялення нашага мястэчка землямерам Юзэфам Жытоўскім, таму што праца па ссяленні гэтага землямера ў найбліжэйшых нашых суседзях <...> дае нам пэўную гарантыю саліднага і справядлівага падзелу нашай зямлі. Гэтага землямера, які пры ацэнцы надзелаў улічвае кожны метр квадратны, не можам не ўхваліць, бо кваліфікаваная і справядлівая ацэнка зямель ёсць першы і найважнейшы чыннік справядлівай і беззаганнай працы па ссяленні» [6, арк. 46].

Карэнная пабудова існуючых аграрных адносін, як камасацыя, не магла не выклікаць канфліктаў паміж уладамі і сялянамі. 19 снежня 1924 г. пасламі (дэпутатамі) Беларускага пасольскага клуба ў Сейм ІІ Рэчы Паспалітай па справе пераходу на хутары вёскі Кушчыцы Клецкай гміны Нясвіжскага павета пададзена інтэрпеляцыя (скарга) [18, с. 169—

170]. Мясцовыя сяляне былі незадаволены тым, што падчас камасацыі не атрымоўвалі дадатковай зямлі, нягледзячы на тое што паводле Закона ад 31 ліпеня 1923 г. новы надзел па грашовай вартасці павінен быць прыкладна роўны страчанаму. Некаторыя землямеры занадта прыхільна адносіліся да падаваемых скарг мясцовых сялян і неаднаразова перараблялі праект ссялення, з-за чаго зацягваліся тэрміны выканання прац. На пачатку 1935 г. у рэдакцыйным артыкуле часопіса «Wies» («Вёска», № 1—2) адзначалася: «Здавалася б, што гаспадарка дзяржаўная нічога на тым не згубіць, калі (пры правядзенні камасацыі) Барташ штосьці страціць, а Мацей атрымае. Калі б праводзіць працу (па камасацыі) такім чынам, то яна б паскорылася ў некалькі разоў» [24, s. 22].

На канец 1934 г. у Навагрудскім ваяводстве было выканана прыкладна 25—30 % патрабуемых работ, аб чым сведчыць табліца [26, s. 449].

| Паветы | Выканана камасацыя | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | вёсак | % | гаспадарак | % | плошча, га | % |
| Баранавіцкі | 46 | 14 | 5678 | 23 | 39 299 | 25 |
| Валожынскі | 102 | 20 | 3799 | 25 | 30 544 | 29 |
| Лідскі | 147 | 20 | 5930 | 14 | 64 199 | 24 |
| Навагрудскі | 90 | 19 | 6775 | 21 | 42 288 | 21 |
| Нясвіжскі | 114 | 51 | 10556 | 48 | 76 438 | 62 |
| Слонімскі | 80 | 28 | 7321 | 33 | 58 035 | 36 |
| Стаўбцоўскі | 94 | 46 | 6920 | 41 | 51 284 | 45 |
| Шчучынскі | 57 | 14 | 4232 | 22 | 25 765 | 24 |
| Усяго | 730 | 23 | 51211 | 26 | 387 852 | 31 |

**Высновы.** Паводле дадзеных статыстыкі на пачатак 1939 г., польскімі ўладамі перaселена на хутары каля 112 400 сялянскіх гаспадарак Навагрудчыны агульнаю плошчаю сельскагаспадарчых зямель прыкладна 703 500 га. Пры ажыццяўленні камасацыі за кошт скарачэння колькасці межавых палосак агульная плошча сялянскіх надзелаў узрастала ад 3 % да 9 %, дзякуючы ўдасканаленню існуючых у аграрнай сферы юрыдычных адносін кошт камасаванай зямлі ўзрастаў у параўнанні з некамасаванай прыкладна на 30 % [27, s. 11—12], памяншалася колькасць патрабуемых сялянскіх працадзён, паляпшалася якасць апрацоўкі зямлі і ўзрастала ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур, у выніку чаго павяліч-

валіся агульны збор збожжа і прыбыткі заходнебеларускіх сялян, якія атрымалі магчымасць пашыраць асабістую гаспадарку, набываць дадатковую ворную зямлю, свойскую жывёлу і прамысловыя тавары.

Пры правядзенні ў 1921—1939 гг. камасацыі паскаралася эканамічная дыферэнцыяцыя сялянства, што было непазбежным вынікам станаўлення ў сельскай гаспадарцы капіталістычных адносін. Дзякуючы камасацыі сяляне Навагрудскага ваяводства змаглі часткова палепшыць асабістае матэрыяльнае становішча, але цалкам вырашыць аграрнае пытанне яна не змагла.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Гольдштейн, И. И.* Аграрные отношения в бывшей Польше, Западной Украине и Западной Белоруссии / И. И. Гольдштейн. М. : Соцэгиз, 1940. 296 с.
2. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). Ф. 550. Воп. 1. Спр. 180. Постановления окружной земельной комиссии об объединении земель деревни Слобода Скарбовая Синявской гмины Несвижского повета.
3. ДАГВ. Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2416. Постановления Гродненской окружной земельной комиссии о ликвидации общих пастбищ и объединении земельных участков.
4. ДАГВ. Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2501. Отчет Гродненского земельного управления о проведении работ по разбивке на хутора земель Новогрудского воеводства.
5. ДАГВ. Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2509. Распоряжение Гродненского пограничного комиссара о выдаче ссуд гражданам при разбивке на хутора деревни Засулье.
6. ДАГВ. Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2862. Дело о разбивке на хутора земель местечка Цирин Новогрудского повета.
7. ДАГВ. Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2863. Дело о разбивке на хутора деревни Ромейки Циринской гмины Новогрудского повета.
8. ДАГВ. Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2865. Дело об освобождении от налогов граждан деревни Новосады-Маяки Лидского повета, подлежащих хуторизации.
9. ДАГВ. Ф. 718. Воп. 1. Спр. 16. Документы об объединении земельных наделов д. Романовичи (решения, протоколы, заявления, переписка и др.).
10. ДАГВ. Ф. 718. Воп. 1. Спр. 21. Документы об объединении земельных наделов д. Голдов (решения, протоколы, заявления, переписка и др.).
11. ДАГВ. Ф. 718. Воп. 1. Спр. 35. Документы об объединении земельных наделов д. Глебовцы (решения, протоколы, заявления, переписка и др.).
12. ДАГВ. Ф. 718. Воп. 1. Спр. 40. Документы об объединении земельных наделов д. Филиповцы (решения, протоколы, заявления, переписка и др.).
13. ДАГВ. Ф. 718. Воп. 1. Спр. 43. Документы об объединении земельных наделов д. Гирдевка (решения, протоколы, заявления, переписка и др.).
14. ДАГВ. Ф. 718. Воп. 1. Спр. 65. Документы об объединении наделов д. Голдов (решения, протоколы, заявления, переписка и др.).
15. ДАГВ. Ф. 718. Воп. 1. Спр. 69. Распоряжения Министерства сельскохозяйственных реформ и переписка с Новогрудским окружным земельным управлением по вопросам объединения земельных наделов.
16. ДАГВ. Ф. 718. Воп. 1. Спр. 74. Документы об объединении земельных наделов д. Кукини (решения, протоколы, заявления, переписка и др.).

17. *Зялінскі, П. І.* Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919—1939 гг.) / П. І. Зялінскі // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф. 17—18 вер. 1999 г., Мінск, БДУ. Мінск, БДУ, 2000. С. 24—30.

18. Інтэрпеляцыі беларускіх паслоў у польскі Сойм 1922—1926 гг.: зборнік дакументаў аб панскіх гвалтах, катаваннях і зьдзеках над сялянамі і рабочымі ў Заходняй Беларусі. Мінск : Бел. дзярж. выд-ва, 1927. 497 с.

19. *Кухарев, Б. Е.* Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919—1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. Минск : Вышэйш. шк., 1975. 112 с.

20. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Навагрудскага раёна. Мінск : Беларусь, 1996. 559 с.

21. *Раманюк, А.* Навагрудчына пад уладай Польшчы (1921—1939 гг.) / А. Раманюк // Назаўсёды разам: гісторыя нацыянальна-дзяржаўнага аднаўлення Беларусі (да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР): матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 28 вер. 2004 г. Мінск : БДПУ, 2004. С. 186—190.

22. *Сорокин, А. А.* Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920—1939 гг.) / А. А. Сорокин. Минск : Наука и техника, 1968. 204 с.

23. *Dworakowski, B.* Wskazowki dla scalajacych grunty / B. Dworakowski, E. Jasinski. Warszawa : Drukarnia S. Sloniewkiego, 1928. 136 s.

24. Nowe drogi Polskiego rolnictwa / Wies (Kraków). 1935. № 1—2. S. 21—23.

25. Nowogrodzkie w latach 1926—1930. [Warszawa], Wydawnictwo BBWR, 1930. 19 s.

26. *Odlanicki-Poczobutt, St.* Wojewodztwo Nowogrodzkie / St. Odlanicki-Poczobutt. Wilno, Nakladem Wilenskiej Izby Rolniczej, 1936. 498 s.

27. Rolnictwo w Polsce. Jaki jest stan rolnictwa i co rzad robi dla jego podniesenia. [Warszawa], Wydawnictwo BBWR, 1930. 32 s.

28. Rozporzadzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 14 stycznia 1927 r. wydane w porozumieniu z Ministrem Skarbu o panstwowej pomocy kredytowej przy scalaniu gruntow // Dziennik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej (DURP). 1927. № 6. Poz. 36. S. 45—47.

29. Rozporzadzenie Rady Ministrow z dnia 20 marca 1922 r. w predmiocie utworzenia okregowych i powiatowych urzedow ziemskich na obszarze wojewodztw: nowogrodzkiego, poleskiego i wolynskiego, oraz powiatow: bialoweskiego, grodzienskiego i wolkowyskiego, wojewodztwa bialostockiego // DURP. 1922. № 41. Poz. 345. S. 636.

30. Ustawa z dnia 31 lipca 1923 r. o scalaniu gruntow // DURP. 1923. № 92. Poz. 718. S. 1050—1056.

## РЭЗЮМЭ. SUMMARY

Рассматривается проведение комасации (хуторизации) на землях Новогрудского воеводства в 1921—1939 гг. Автор показывает необходимость осуществления в Западной Беларуси аграрной реформы. Проведение комасации сопровождалось выдачей крестьянам кредитов. Благодаря проведению в Новогрудском воеводстве хуторизации уменьшилось количество необходимых крестьянам трудодней для обработки личного надела, улучшилось качество обработки земли и выросла ее урожайность.

The article tells about the realization of comasation in Novogrudok Voivodeship in 1921—1939. The author shows suffering of local peasantry and necessity of the agrarian reform which was realized by Polish government in 1921—1939. Realization of comasation was accompanied by distribution of credits. Thanks to comasation in Novogrudok Voivodeship the quantity of working days necessary for peasants for the cultivation their lands decreased, quality of cultivation agriculture lands was improved and accordingly its crop capacity increased.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 26 жніўня 2011 г.